# "Мелодыяграфія" Паўла Семчанкі

**У галерэі "Панарама" Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі працуе выстава каліграфіі "Мелодыяграфія" знакамітага мастака-каліграфа, прафесара Паўла Апанасавіча Семчанкі.**

У экспазіцыі — 45 твораў, выкананых аўтарам у розныя гады, на розным матэрыяле і ў розных тэхніках, у тым ліку ў тых, якія ён вынаходзіць сам. Павел Апанасавіч Семчанка заўсёды, асабліва ў работах апошняга дзесяцігоддзя, выступае як мастак-тэхнолаг, мастак-дызайнер, мастак-рамеснік, які вельмі тонка адчувае і разумее матэрыял, па-мастацку яго перапрацоўвае, стварае неверагодна ўзнёслыя, лёгкія, артыстычныя вобразы. У сваёй творчасці ён па-ранейшаму актыўна працягвае эксперыментаваць, пра што яскрава сведчаць яго найноўшыя цыклы работ, выкананыя метадам траўлення і дэталёвай апрацоўкі шрыфтоў разцом, на тэмы музыкі — "Бах", "Бетховен", "Моцарт" (невыпадкова выстава атрымала назву "Мелодыяграфія"). Прадстаўлены ў экспазіцыі і ранейшыя, ужо культавыя ў беларускім мастацтве, творы — каліграфічныя лісты па матывах паэзіі Максіма Багдановіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа, "Песні пра зубра" Міколы Гусоўскага і інш.



**Каліграфічны подпіс да верша Цёткі "Татулечка, я хачу чытаць", 1981 г.**

11 лістапада ў галерэю "Панарама", што размясцілася на 22-м паверсе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, павіншаваць майстра з адкрыццём яго персанальнай выставы, а таксама з 70-гадовым юбілеем прыйшлі многія вядомыя людзі: Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Украіны ў Рэспубліцы Беларусь Ігар Ліхавы (П.А.Семчанка нарадзіўся ва Украіне і ніколі не губляў сувязей са сваёй малой радзімай), рэктар Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ (менавіта ў гэтай установе сёння працуе мастак) Пётр Іванавіч Брыгадзін, які выканаў даручэнне Міністра адукацыі Аляксандра Міхайлавіча Радзькова аб узнагароджанні П.А.Семчанкі ганаровай граматай; выкладчыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (тут юбіляр выкладаў на працягу 37 гадоў, з іх — 25 гадоў на кафедры графічнага дызайну, дзе заснаваў курс мастацкага шрыфту дый наогул беларускую нацыянальную школу каліграфіі); прадстаўнікі Беларускага саюза мастакоў, сярод якіх нямала вучняў Паўла Апанасавіча. Многія з выступоўцаў адзначалі выключнасць культурнай місіі гэтага чалавека ў Беларусі: паступіўшы на факультэт дызайну Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута, ён свядома сярод шматлікіх галін дызайну абраў для вывучэння і развіцця абсалютна не распрацаваную ў той час у Беларусі галіну мастацкага шрыфту, заснаваў адпаведную кафедру, напісаў некалькі манаграфій ("Асновы шрыфтавой графікі", "Мелодыя каліграфа" і інш.), выхаваў дзесяткі паслядоўнікаў, ініцыіраваў стварэнне суполкі "Літарт" (мастацтва літары), удзельнікі якой зладзілі ўжо больш за 10 знакавых выстаў. Гаварылі і пра незвычайную шчодрасць чалавечай сутнасці П.А.Семчанкі, неардынарнасць і шматграннасць яго творчай душы, прыцягальнасць яго асобы для студэнтаў. Так, як стала вядома, апрача свайго самага значнага захаплення — каліграфіі, Павел Апанасавіч займаецца рэстаўрацыяй буйнамаштабных гадзіннікаў. А галоўнае — творчасць П.А.Семчанкі сведчыць пра сапраўдную актуальнасць класічнага (іншай каліграфія і не можа быць) напрамку ў прасторы сучаснага мастацтва, перакана ўча сцвярджае непахіснасць таго грунту, без якога немагчымы ніякія (у тым ліку і авангардныя) мастацкія прарывы.

Сам жа майстар прызнаўся, што не ведае, ці напісаў ён ужо свой самы значны твор. "Сапраўдны мастак ведае толькі тое, што ўсё жыццё ён стварае штосьці адно, вартае чагосьці. Астатняе ж — гэта толькі прэлюдыя. І ніхто на самай справе яшчэ ніколі не скончыў той твор, пра які ён сам мог бы сказаць, што гэта — усё".

Выстава "Мелодыяграфія" будзе працаваць да пачатку снежня.

**Мікола ЧЭМЕР.**